*М. А. Волкаў, С. Б. Лінevіч*

# Гісторыя і ваенны патэнцыял Жаберскага замка паводле пісьмовых і археалагічных крыніц

На тэрыторыі Беларусі існуе шмат непрыкметных вёсак з багатай гістарычнай спадчынай. Адна з такіх вёсак – Жабер. Яна размешчана ў заходняй частцы Беларускага Палесся на правым беразе ракі Ясельда (Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці). Назва «Жабер», верагодна, паходзіць ад славянскага слова «жабар» ці «жабарына» – невялікая сажалка, балота. Пазней так маглі называць таксама рэкі [5, с. 118]. Упершыню Жабер згадваецца ў крыніцах у сярэдзіне XVI ст., але вядомасць паселішчу прынеслі падзеі Вялікай Паўночнай вайны 1700–1721 гг.

У 1706 г. войскі шведскага караля Карла XII узялі ў аблогу і знішчылі магутны бастыённы замак у Жаберы. Пазней фартэцыя не аднаўлялася, а ў народнай памяці падзеі тых часоў абраслі таямнічымі легендамі пра схаваныя ў замку скарбы роду Вішнявецкіх і затопленыя ў Ясельдзе гарматы. З-за недахопу крыніц дакладнай інфармацыі пра Жаберскі замак мы маем не так шмат. Аднак нават той сціплы матэрыял, які выяўлены на цяперашні час, сведчыць пра тое, што гэты аб'ект заслугоўвае асаблівай увагі і паглыбленага даследавання, а многія інтрыгуючыя легенды пра яго маюць пад сабою глебу і могуць у далейшым прывесці да цікавых адкрыццяў.

## Гісторыя маёнтка і замка ў Жаберы

Кароткае апісанне гісторыі і архітэктуры Жаберскага замка на падставе пісьмовых крыніц і натурных назіранняў зрабіў М. Ткачоў [16, с. 50–52]. Аднак на цяперашні час яно патрабуе ўдакладнення з прычыны выяўлення новых пісьмовых крыніц, археалагічнага абследавання помніка, а таксама пашырэння нашых ведаў аб абарончай архітэктуры Беларусі XVI–XVIII стст.

Упершыню ў пісьмовых крыніцах Жабер згадваецца ў 1546 г. Тады Станіслаў Якубавіч Некрашэвіч запісаў *«маёнтак Жабер з мястэчкам Хомскам»* на карысць сваёй жонкі [32, p. 194]. З іншых крыніц сярэдзіны – другой паловы XVI ст. вядома, што ў гэты час Жабер з'яўляўся дваром [11; 12; 13; 14; 26] [1]. Такім чынам, моцнага абарончага ўмаца-

[1] Аўтары выказваюць шчырую падзяку Герману Брэгеру, які выявіў крыніцы XVI ст. па гісторыі Жабера і даў іх копіі для падрыхтоўкі гэтага артыкула.




Іл. 1. Хомск на карце Томаша Макоўскага. *1613 г.*

вання, якое ў крыніцах таго часу абазначалася тэрмінам «замак», тут у адзначаны час не існавала.

Гандлёва-рамесным цэнтрам Жаберскага маёнтка быў Хомск, які ўпершыню згадваецца ў 1518 г. [17, с. 76]. У крыніцах XVI ст. паселішча часта называецца Холмскам, што сведчыць аб паходжанні яго назвы ад слова «холм». Іншымі словамі, яно было размешчана на ўзвышшы над багністымі абсягамі ўздоўж Ясельды. Паколькі ў дакуменце 1546 г. Хомск названы мястэчкам, гэты статус ён атрымаў ужо ў першай палове XVI ст. Да пачатку XVII ст. мястэчка значна ўзрасло і было адлюстравана на падрыхтаванай у гэты час карце Вялікага Княства Літоўскага Т. Макоўскага. Паколькі ў Хомску была засяроджана гандлёва-рамесная дзейнасць, Жабер ужо ў XVI ст. функцыянаваў пераважна як адміністрацыйны цэнтр маёнтка.

Паводле пісьмовых крыніц сярэдзіны XVII ст., у Жаберы меўся двор, які, зыходзячы з падзей вайны 1654–1667 гг., не меў істотнага ваеннага значэння. У гэты час жаберскі маёнтак належаў княжацкім родам Дольскіх і Язерскіх і часткова знаходзіўся ў заставе ў шляхціца Войцеха Станіслава Чарвінскага. У 1660 г. гэтыя землі былі спустошаны маскоўскімі войскамі, якія дзейнічалі ў рэгіёне. Вядома, што ў сакавіку 1660 г., калі царскае войска на чале з Іванам Хаванскім ішло з Берасця і спынілася ў Бярозе, вайсковы атрад уварваўся ў мястэчка Хомск і спаліў яго. 14 сакавіка мясцовы шляхціц Дамінік Эйсмант, які жыў непадалёку і

меў нейкі асабісты канфлікт з уладальнікам Жабера В. С. Чарвінскім, з'явіўся пад дваром Жабер са сваімі людзьмі, якіх было каля 20 чалавек, і пад выглядам маскоўскіх жаўнераў з крыкамі: «Рубі! Рубі!», – захапіў яго. Пры гэтым слуга В. С. Чарвінскага нейкі Навіцкі, думаючы, што напалі маскоўскія жаўнеры, кінуўся ў раку па шыю і ледзьве не патануў. Такім чынам, двор знаходзіўся недзе побач з ракой, верагодна, на тым месцы, дзе пазней быў узведзены замак. На той час у ім меліся два свірны, пограб і бровар [8].

Пабудову магутных земляных умацаванняў у Жаберы трэба звязваць з дзейнасцю вялікага маршалка ВКЛ Яна Караля Дольскага (1637–1695), які пры падтрымцы караля Яна III Сабескага здолеў зрабіць бліскучую кар'еру. Першая рэзідэнцыя Дольскіх знаходзілася ў мястэчку Дольск на тэрыторыі сучаснай Украіны, літаральна ў некалькіх кіламетрах ад беларускай мяжы (Любяшоўскі раён Валынскай вобласці). З уздымам палітычнай вагі і эканамічнай магутнасці Я. К. Дольскі ў другой палове XVII ст. заклаў і разбудаваў у Пінскім павеце дзве новыя ўмацаваныя рэзідэнцыі – у Караліне каля Пінска і ў Жаберы.

Узвядзенню замка ў Жаберы папярэднічала канцэнтрацыя Я. К. Дольскім у сваіх руках усяго жаберскага маёнтка. Паводле звестак 1677 г., у ім налічвалася 422 падданыя, з якіх збіраліся падаткі [25]. З улікам дзяцей і старых колькасць жыхароў маёнтка магла перавышаць 1000 чалавек [28, s. 245].

З дзённіка маршалка ВКЛ Караля Станіслава Радзівіла вядома, што Жаберскі замак актыўна выкарыстоўваўся Я. К. Дольскім у якасці асабістай рэзідэнцыі ў канцы XVII ст. Так, у 1690 г. К. С. Радзівіл спыняўся ў Жаберы ў магната ажно пяць разоў, у 1691 – двойчы, а ў 1692 – аднойчы. Частыя прыезды дзяржаўнага ўрадніка ўказваюць на тое, што, па-першае, рэзідэнцыя выкарыстоўвалася Я. К. Дольскім для сталага пражывання, і, па-другое, яна была ў дастатковай ступені разбудавана і сведчыла аб высокім статусе гаспадара. Вялікае значэнне жаберская рэзідэнцыя захавала і пасля смерці Я. К. Дольскага. У прыватнасці, у 1696 г. К. С. Радзівіл спыняўся ў Жаберы ва ўдавы магната Ганны. Толькі ў 1700 г. апошняя пакінула замак над Ясельдай і выехала ў Варшаву. Пасля яе смерці ўся спадчына Я. К. Дольскага адышла да Міхала Сервацыя Вішнявецкага, які ажаніўся з дачкой магната Кацярынай. Новы ўласнік працягваў выкарыстоўваць Жаберскі замак у якасці рэзідэнцыі. У прыватнасці, К. С. Радзівіл гасцяваў у яго ў 1703 г. [19]

Як паказалі падзеі Вялікай Паўночнай вайны, фартэцыя ў Жаберы набыла пры М. С. Вішнявецкім вялікае ваеннае значэнне для абароны рэгіёна і забеспячэння палявой арміі ВКЛ. Асаблівасці земляных фартыфікацый Жаберскага замка сведчаць аб тым, што ён быў узведзены па т.зв. старагаландскай фартыфікацыйнай сістэме, распаўсюджанне якой

на нашых землях пачалося ў 1620–1630 гг., а ў сярэдзіне – другой палове XVII ст. яна цалкам дамінавала ў абарончым будаўніцтве [4]. На пачатку Вялікай Паўночнай вайны Жаберскі замак быў забяспечаны значным гарнізонам і артылерыяй [18, p. 222, 228; 23, s. 84–85; 31, p. 89].

Магчымасць забяспечыць Жабер гарнізонам і ўзбраеннем М. С. Вішнявецкаму давала тое, што ён на пасадзе польнага, а затым вялікага гетмана кіраваў узброенымі сіламі ВКЛ, прынамсі, той іх часткай, якая захоўвала адданасць каралю Аўгусту II. З тых жаўнераў, якія былі ў гарнізоне замка ў 1706 г., большасць, верагодна, належала да дзяржаўнага войска. Таксама і значная частка гармат, якія меліся ў Жаберскім замку, не адносіліся да ўласнага артылерыйскага парка фартэцыі. Пэўная колькасць гармат належала да дзяржаўнай артылерыі ВКЛ. У прыватнасці, да нашага часу захавалася гармата 1631 г. ліцця з дзяржаўным гербам Рэчы Паспалітай, знойдзеная ў Жаберы ў пачатку XX ст. [29]. Яна была адліта вядомым людвісарам Ёганам Бройтэльтам, які ў перыяд з 1629 па 1647 гг. працаваў у Вільні [27, p. 20–21; 34, s. 382]. Перавоз часткі артылерыі ВКЛ у Жабер вынікаў не толькі з імкнення ўмацаваць гэтую фартэцыю, але і з жадання захаваць зброю ад захопу непрыяцелем.

Для забеспячэння Жаберскага замка таксама былі выкарыстаны гарматы з іншых фартэцый. Вядома, што ў сакавіку 1703 г. сюды былі перавезены тры цяжкія гарматы з Ляхавіцкага замка: «Пярун» вагамерам 22 фунты, «Кантар» [2] – 20 фунтаў і «Фарэнсбахавы [3] дзед» – 11 фунтаў. Фартэцыя ў Ляхавічах належала Сапегам, якія з'яўляліся палітычнымі праціўнікамі М. С. Вішнявецкага, таму вываз артылерыі адтуль фактычна меў характар рэквізіцыі. Прычым загад зыходзіў ад самога гетмана. Трэба адзначыць, што абсалютная большасць гармат Ляхавіцкага замка, у тым ліку тыя, што былі перададзены ў Жабер, на той час ужо не мелі лафетаў, і толькі некаторыя мелі лафеты без кол [21]. Верагодна, прывезеныя ў Жаберскі замак гарматы былі забяспечаны лафетамі і пастаўлены на ўзбраенне фартэцыі.

На пачатковым этапе Вялікай Паўночнай вайны намаганнямі М. С. Вішнявецкага Жаберскі замак фактычна быў пераўтвораны ў адну з найбольш магутных фартэцый у ВКЛ. Аднак нягледзячы на гэта, ён не змог даць адпор шведам у 1706 г. і быў разбураны. Падзеі разгортваліся наступным чынам.

28 красавіка 1706 г. шведская армія, мэтай якой было дагнаць адступаючую з Гародні расійскую армію, праз Дзярэчын і Ружаны дасягнула

[2] Ад лац. «Cantor» – спявак, арганіст, настаўнік спеваў.

[3] На гармаце, відавочна, меўся герб ці надпіс, які ўказваў на яе заказчыка – аднаго з прадстаўнікоў нямецкага роду Фарэнсбахаў з Інфлянтаў: Георга (1551–1602), Вольмара (1586–1633) ці Ёгана (пам. 1627).

Бярозы. Там быў разбіты расійскі атрад, які прыкрываў пераправу праз Ясельду. Далей шведы рушылі ўздоўж паўднёвага берага ракі і 4 мая ўвайшлі ў Пінск. Падчас гэтага маршу Карл XII, які асабіста кіраваў арміяй, не меў намеру губляць час на аблогу і здабыванне Жаберскага замка і абышоў яго, пакінуўшы для блакіравання фартэцыі па розных дадзеных ад 150 да 300 жаўнераў [4] [24, s. 304; 31, p. 86]. Для шведскага караля было важна вырашыць галоўную задачу ваеннай кампаніі зімы 1705–1706 гг.: разбіць расійскую армію, якая адступала з Гародні, таму ён спяшаўся на поўдзень. Аднак у Пінску стала зразумела, што дагнаць армію праціўніка не ўдасца, і Карл XII прыняў рашэнне ачысціць тылы сваёй арміі, а разам з тым сілай прымусіць перайсці на яго бок тую частку магнатаў і шляхты ВКЛ, якія ўсё яшчэ супрацьстаялі шведам і не прызнавалі шведскага стаўленіка Станіслава Ляшчынскага каралём Рэчы Паспалітай.

З тых фартэцый на землях ВКЛ, якімі шведы авалодалі вясной 1706 г., Жаберскі замак быў наймацнейшай. Ляхавіцкі замак быў магутным абарончым умацаваннем, і на момант падыходу шведаў у ім меўся 1361 абаронца, але, як згадвалася вышэй, у 1703 г. з яго была вывезена амаль уся артылерыя. У гарнізоне Нясвіжскага замка мелася ўсяго сотня прафесійных жаўнераў, таму, нягледзячы на добрыя фартыфікацыі і ўзбраенне, ён не мог аказаць сур'ёзнае супраціўленне [3, с. 226–229]. У сваю чаргу, Жаберскі замак быў добра забяспечаны гарнізонам, артылерыяй, амуніцыяй і правіянтам. У 1706 г. у ім знаходзілася 815 жаўнераў і 58 гармат [5] [23, s. 84–85]. Артылерыя была размешчана на бастыёнах і валах і падрыхтавана да абароны. Гарнізонам замка камандаваў палкоўнік Ян Бутман (Jan Buttman) [22, s. 195]. Яго намеснікам быў Петэр

---

[4] Лічба жаўнераў, накіраваных для блакіравання Жаберскага замка, была, прынамсі, у тры разы меншая, чым гарнізон фартэцыі, у якім было 815 чалавек. Такім чынам, нават невялікі атрад шведаў мог эфектыўна блакіраваць больш значныя сілы. Гэта тлумачыцца нізкім маральным духам абаронцаў і нежаданнем уступаць у сутычкі з жаўнерамі Карла XII, што пагражала жорсткай расправай. Разам з тым гарнізон актыўна рыхтаваўся да супраціўлення і капітуляваў толькі праз два тыдні, калі шведскія войскі пачалі падрыхтоўку да штурму. Відавочна, абаронцы мелі надзею, што шведы не будуць штурмаваць фартэцыю і адыдуць.

[5] Паводле Г. Адлерфельда, на момант капітуляцыі ў Жаберскім замку мелася 700 чалавек і 40 гармат [18, p. 228], паводле Ё. Нордберга – 800 чалавек і 48 гармат [31, p. 89]. Аднак больш вартымі даверу з'яўляюцца звесткі, змешчаныя ў дзённіку Л. Кага, у якім згадваецца пра 815 чалавек і 58 гармат. Прычым у крыніцы дакладна пералічана колькасць афіцэраў і жаўнераў жаберскага гарнізона, таму яго аўтар альбо быў непасрэдным сведкам гэтай падзеі, альбо мог карыстацца дакументамі [21, s. 84–85]. У сваю чаргу лічбы, прыведзеныя Г. Адлерфельдам і Ё. Нордбергам, выглядаюць як абагульненыя.



Іл. 2. Жаберскі замак. *Здымак Google 2016 г.*

Лемкэ (Peter Lemke, Lembke), які меў ранг маёра ці, паводле іншых крыніц, падпалкоўніка [6]. Шведы высока ацанілі патэнцыял фартыфікацыйных умацаванняў Жаберскага замка. Фартэцыя мела чатыры бастыёны, глыбокі роў, а яе абарончы перыметр быў дадаткова ўмацаваны палісадамі. З усіх бакоў яна была акружана непраходнымі балотамі [18, p. 222, 228; 31, p. 85–86, 88–89]. Падыход да фартэцыі меўся толькі з усходняга боку. Гэта ўскладняла вядзенне аблогі. Такім чынам, Жаберскі замак мог пэўны час эфектыўна абараняцца ад значнай вайсковай групоўкі.

30 красавіка 1706 г. пад Клецкам шведскі корпус на чале з Карлам Густавам Крэйцам разграміў значны расійска-казацкі корпус на чале з Сямёнам Няплюевым, які рухаўся на дапамогу заблакіраванаму Ляхавіцкаму замку. Гэта стала прычынай хуткай капітуляцыі згаданай фартэцыі. Аднак падзенне баявога духу ахапіла не толькі абаронцаў Ля-

---

[6] Шведскі даследчык Хокан Хенрыксан выявіў у шведскіх архівах інфармацыю пра П. Лемкэ, за што аўтары выказваюць яму шчырую падзяку. У прыватнасці, вядома, што П. Лемкэ прыбыў у Швецыю у якасці палоннага ў лістападзе 1706 г. Пры гэтым ён быў названы саксонскім афіцэрам у рангу падпалкоўніка.

хавічаў. Ва ўмовах, калі ў рэгіёне дзейнічаў сам непераможны Карл XII, а дапамогі з боку расійскіх ці казацкіх войскаў пасля разгрому корпуса С. Няплюева чакаць не даводзілася, надзея на поспех у адкрытым супрацьстаянні са шведамі развеялася.

Пра нізкі баявы дух жаўнераў ВКЛ сведчыць цікавы эпізод. 3 мая 1706 г. падчас маршу на Пінск група шведскіх афіцэраў (агулам 15–16 чалавек) збілася з дарогі і трапіла на вайсковы атрад прыхільнікаў антышведскай Сандамірскай канфедэрацыі, які падпарадкоўваўся Людвіку Пацею. Ён складаўся з трох пяхотных рот, 70 вазоў прыпасаў і меў на мэце, як мага хутчэй трапіць у жаберскую фартэцыю. Нягледзячы на значную колькасную перавагу, атрад здаўся шведам. Было вырашана афіцэраў пакінуць у палоне, а простых жаўнераў адпусціць, адрэзаўшы ім палову барады і зрэзаўшы падолы вопраткі. Гэта сведчыць аб жаданні шведаў мінімалізаваць колькасць палонных, каб захаваць мабільнасць арміі. Яшчэ адной важнай дэталлю з'яўляецца тое, што ў кіраўніка атрада падпалкоўніка Кайнерта быў знойдзены ліст ад Л. Пацея да каменданта Жабера. Паводле яго, Я. Бутман павінен быў пры падыходзе шведскіх войскаў затапіць гарматы і сысці з гарнізонам у балоты [31, p. 86]. Такім чынам, у поспех абароны фартэцыі ад шведаў ва ўмовах падзення маральнага духу жаўнераў і адсутнасці надзеі на дапамогу не верылі.

5 мая, ці праз дзень пасля ўступлення Карла XII у Пінск, атраду, які стаяў у Жаберы, быў высланы загад працягваць блакіраванне замка і чакаць падыходу больш значных сіл. 9 мая на дапамогу ім падышоў вялікі корпус на чале з генерал-маёрам Юханам Аўгустам Меерфельтам. У яго складзе былі два драгунскія палкі (самога Меерфельта і палкоўніка Густава Адама Таўбэ), таксама конны полк Карла Габрыэля Горна і пяхотны полк генерала Магнуса Стэнбака [23, s. 84; 24, s. 305]. Вясной 1705 г. у палку Ю. А. Меерфельта налічвалася 1000 жаўнераў, Г. А. Таўбэ – 800, К. Г. Горна – 1000, М. Стэнбака – 1200 [15, с. 241–242]. Такім чынам, пры аблозе Жаберскага замка магло быць засяроджана больш за 4000 жаўнераў. Нягледзячы на канцэнтрацыю значных сіл шведаў, абаронцы надалей адмаўляліся скласці зброю.

12 мая ў Пінску да Карла XII прыехаў С. Ляшчынскі, які рухаўся з часткай шведскага войска. Ён распавёў шведскаму каралю пра няўдалыя перамовы з камендантам блакіраванай фартэцыі ў Жаберы. Паводле яго слоў, на прапанову аб капітуляцыі Я. Бутман адказаў агнём з гармат. У такіх абставінах Карл XII сам накіраваўся да Жабера, агледзеў блакіраваную фартэцыю і ад'ехаў назад у Пінск па артылерыю [18, p. 228; 31, p. 88–89]. Апошняе сведчыць, што захоп фартэцыі для шведаў быў няпростай задачай, і яны пачалі падрыхтоўку да аблогі паводле ўсіх правілаў ваеннага мастацтва. У той жа дзень каменданту быў выстаўле-

ны ўльтыматум аб здачы фартэцыі на працягу 24 гадзін [24, s. 305–306]. Урэшце, убачыўшы падрыхтоўку шведаў да аблогі, Я. Бутман выслаў да іх парламенцёраў і пачаў перамовы аб капітуляцыі. Паводле Леанарда Кага, фартэцыя была здадзена 12 мая [23, s. 84]. Першым на тэрыторыю Жаберскага замка ўвайшоў палкоўнік К. Г. Горн на чале свайго палка. Гарнізон у колькасці 815 чалавек (1 палкоўніка, 1 маёра, 8 капітанаў, 2 старшых лейтэнантаў, 15 лейтэнантаў, 14 харужых, 3 ад'ютантаў, 771 жаўнера) быў прыняты ў якасці ваеннапалонных. Падчас агляду захопленай фартэцыі было выяўлена 58 гармат, вялікая колькасць вайсковага рыштунку, харчовыя прыпасы, а таксама трафеі, захопленыя войскам ВКЛ у шведаў у папярэднія гады [23, s. 85]. Таксама было вызвалена 16 палонных шведаў і палкоўнік Аляксандр Хумер'ельм, узяты ў палон М. С. Вішнявецкім падчас бітвы пры Дарсунішках 24 сакавіка 1702 г. [2, с. 21; 18, p. 228; 31, p. 88–89]. Камендант Я. Бутман і, магчыма, некаторыя іншыя афіцэры былі адпраўлены ў далейшым у Швецыю [22, s. 195].

Паводле Юльяна Урсын-Нямцэвіча, які апісваў гэтыя падзеі больш чым праз стагоддзе, войскі Карла XII не пачыналі аблогу Жаберскага замка з выкарыстаннем артылерыі. Камендант замка (Ю. Нямцэвіч называе яго Ботманам) за 2 тыс. дукатаў адчыніў вароты замка, а шведскі кароль, які хранічна не вытрымліваў здрады, асабіста яго забіў [30, s. 397]. Аднак гэтая інфармацыя не пацвярджаецца іншымі крыніцамі і, па ўсёй верагоднасці, не адпавядае рэчаіснасці.

Пасля капітуляцыі жаберскага гарнізона Карл XII загадаў зруйнаваць умацаванні і знішчыць артылерыю замка. Шведы наўпрост не хацелі пакідаць у сваіх тылах умацаваныя аб'екты, якія пры адыходзе мог заняць праціўнік. Пры гэтым знішчаліся ўмацаванні не толькі праціўнікаў, але і саюзнікаў. Напрыклад, былі разбураны фартыфікацыі Ляхавіцкага замка Сапегаў, якія актыўна падтрымлівалі шведаў. Вядома, што 23 мая 1706 г. Карл XII заехаў у Жабер, каб асабіста агледзець, як ішло руйнаванне фартэцыі. Неўзабаве шведы пакінулі паселішча і рушылі на поўдзень. Такім чынам, разбурэнне Жаберскага замка працягвалася крыху больш за 10 дзён [18, p. 232]. Пасля гэтага ўмацаваная рэзідэнцыя ў Жаберы была закінута і больш не аднаўлялася. Вядома, што ў 1730 г. сюды прыязджаў Міхал Казімір Радзівіл і аглядаў *«месца зруйнаванай фартэцыі»* [20, s. 403].

Найбольш інтрыгуючым пытаннем, на якое дасюль не ўдалося знайсці адказу ў пісьмовых крыніцах, з'яўляецца лёс арсенала і значных ваенных запасаў, якія захоўваліся ў Жаберскім замку. Са шведскіх крыніц вядома толькі тое, што гарматы і ўсе запасы былі знішчаны [23, s. 85; 24, s. 305; 18, p. 228–229; 31, p. 89]. Пазнейшыя знаходкі засведчы-

лі, што пэўная частка ўзбраення і боепрыпасаў была затоплена побач з фартэцыяй.

Паводле справы, якая захавалася ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродна, у пачатку XX ст. у вадзе каля замка былі знойдзены 9 гармат і некалькі гарматных ядраў. З іх 5 забраў аканом Хомскага маёнтка, 3 – селянін з вёскі Алясец Пяскоўскай воласці Слонімскага павета, а адну гармату не атрымалася выцягнуць з вады [9]. Пра знаходку 9 гармат жыхарамі вёскі Жабер паведамляе і Е. Р. Раманаў, які ўказвае, што некалькі гармат было *«венгерскай работы»* 1667 г. ліцця [10, с. 68]. У 1962 г. супрацоўнік Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея І. В. Біруля зафіксаваў успаміны жыхара вёскі Гнілец А. Лебядзінскага, які ў пачатку XX ст. спрабаваў з памочнікамі выцягнуць гармату. Пад яе быў праведзены ланцуг, але выцягнуць не атрымалася. Селянін дакладна пазначыў месцазнаходжанне гарматы, аднак І. В. Біруля не змог арганізаваць экспедыцыю па яе пошуку [1]. Пры гэтым незразумела, ці была гэта адна з тых 9 гармат або нейкая іншая.

Большасць гармат, знойдзеных у Жаберы ў пачатку XX ст., верагодна, яшчэ ў часы Расійскай імперыі былі пушчаны на пераплаўку. Аднак адну з іх – гармату Ё. Бройтэльта 1631 г. ліцця, пра якую згадвалася вышэй, – удалося захаваць мясцоваму шляхціцу Антонію Выслявуху. Ён закапаў гармату на тэрыторыі свайго маёнтка Піркавічы (цяпер вёска Пярковічы Драгічынскага раёна). Там яна захоўвалася да ліпеня 1920 г., калі А. Выслявух вывез гармату разам са сваёй бібліятэкай, архівам і калекцыяй старажытнасцей у Варшаву [7]. У далейшым яна была перададзена ў Музей Войска Польскага ў Варшаве, дзе захоўваецца ў цяперашні час.

Паводле інфармацыі, атрыманай ад мясцовых жыхароў, знаходка 9 гармат у пачатку XX ст. была не адзіным выпадкам. Паводле іх слоў, за апошнія 20 гадоў т.зв. «чорнымі капальнікамі» было знойдзена яшчэ 3 ці 4 гарматы, адна з якіх, магчыма, захоўваецца ў прыватнай калекцыі ў Бярозе. Разам з гісторыямі пра гарматы сярод мясцовага насельніцтва распаўсюджана гісторыя пра знаходку археолагамі манетнага скарбу ў 1960-х гг. Скарб нібыта быў знойдзены ў студні на тэрыторыі фартэцыі, а вага знойдзеных каштоўнасцей складала 16 ці 20 пудоў срэбра. Тым не менш, знаходка скарбу такога аб'ёму не зафіксавана ў дакументах. Вядома, што ў 1962 г. супрацоўнікам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея М. І. Алексеюком на тэрыторыі Жаберскай фартэцыі былі знойдзены медныя польскія і літоўскія шэлягі часоў Яна Казіміра II, але абставіны знаходкі і месца захавання манет вызначыць не ўдалося [33].

## Археалагічнае вывучэнне Жаберскага замка

На цяперашні час замчышча ў Жаберы ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як помнік археалогіі пад шыфрам 113Г000194. Яно размешчана на адлегласці 1,5 км на паўночны ўсход ад сучаснай вёскі Жабер, на правым беразе ракі Ясельда, ва ўрочышчы «Замак». Плошча пляцоўкі помніка складае 1,5 га. Замчышча на 5–7 м узвышаецца над навакольнай мясцовасцю і мае форму, блізкую да чатырохвугольніка з трыма вялікімі бастыёнамі на паўночна-ўсходнім, паўднёва-ўсходнім і паўднёва-заходнім вуглах, і невялікім бастыёнам на паўночна-заходнім вугле. Яшчэ адзін, пяты, бастыён невялікіх памераў размешчаны з боку ракі каля вялікага паўднёва-заходняга бастыёна. Паміж сабой яны злучаюцца валам вышынёй да 2–2,5 м. З поўначы, усходу і поўдня замак быў абведзены вадзяным ровам шырынёй да 20 м. З заходняга боку пляцоўка прымыкае да рэчышча Ясельды. На сённяшні дзень помнік цалкам засаджаны лесам, вадзяныя равы забалочаны і часткова параслі хмызам. З усходняга боку роў быў часткова асушаны падчас меліярацыі. Па ўсёй тэрыторыі помніка назіраюцца сляды рабаўнічых раскопак.

Першыя даследаванні Жаберскага замка былі праведзены ў 1970-х гг. супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН БССР кандыдатам гістарычных навук М. А. Ткачовым. Быў складзены прыкладны план помніка, апісана тапаграфічная сітуацыя. У 1993 г. археалагічныя даследаванні на замку праводзіў супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. В. Іоў. У паўночна-ўсходняй частцы замка былі закладзены 2 шурфы агульнай плошчай 40 $м^2$. Былі выяўлены фрагменты ганчарнага посуду, кафлі, шкляныя вырабы і манеты XVI–XVIII стст. [6].

У 2015 г. з ініцыятывы А. В. Іова даследаванні на замку былі адноўлены. Супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі С. Б. Ліневічам, А. М. Вашанавым і М. А. Волкавым разам з дайвінг-цэнтрам «Марскі пегас» на чале з А. С. Ліхачовым было праведзена падводнае археалагічнае абследаванне помніка. У першую чаргу быў вывучаны правы бераг Ясельды каля замкавай пляцоўкі. Тэрыторыя даследавання была акрэслена равамі і цэнтрам рэчышча. Агульная даўжыня зоны абследавання склала 267 м, шырыня да 30 м. Падводны агляд паказаў наяўнасць тоўстага слою глею на дне ракі, асабліва ў прылеглых да помніка пляцоўках. Глеевыя адкладанні нетрывалыя, лёгка размываюцца, пакідаючы муць. Магутнасць адкладанняў – 0,2–0,5 м, змяншаецца пры аддаленні ад берага. Бачнасць пад вадой складала не болей за 0,1–0,15 м, у выніку чаго абследаванне дна вялося тактыльным метадам і пры дапамозе падводнага металадэтэктара. Было высветлена, што пад пластом глею ўздоўж усёй замкавай пляцоўкі дно ракі моцна насычана

артэфактамі XVI–XVII стст. Знаходкі прадстаўлены вырабамі з гліны, шкла і металу.

Найбольш шматлікай катэгорыяй знаходак з'яўляюцца абломкі непаліваных ганчарных гаршкоў – 12 фрагментаў, рынак – 2. Таксама зафіксаваны 3 фрагменты пасудзін з жоўтай, шэрай і зялёнай палівай. Другой па колькасці катэгорыяй знаходак з'яўляюцца рэшткі пячной кафлі. Агулам выяўлена 13 фрагментаў непаліванай кафлі, сярод іх – 6 упрыгожаны раслінным арнаментам, а ў правым верхнім куце аднаго маецца літара «А». Адзін фрагмент пакрыты палівай зялёнага колеру. Падчас падводнага абследавання ў прыбярэжнай зоне быў выяўлены аскепак шкляного вырабу – плечуковая частка ад бутэлькі-кварты. Артэфакт зроблены з шурпатага непразрыстага шкла зеленаватага адцення. З двух бакоў паверхня пакрыта жоўтым налётам.

Каля невялікага бастыёна ў рацэ была знойдзена жалезная сякера. Яе даўжыня – 19 см, шырыня абушка – 4,5 см, даўжыня ляза – 10 см. Каля абушка размяшчаецца кляймо ў выглядзе трохкутніка з бакамі па 2,5 см, сфарміраванага з 3-х кветак. Кожная кветка мае па 8 пялёсткаў. Паверхня сякеры каразіравана, пакрыта пацінай блакітнага колеру. Характар і датаванне знойдзеных у рацэ артэфактаў сведчаць пра высокую верагоднасць таго, што замак быў узведзены на месцы двара Жабер, пра які згадваюць крыніцы XVI – сярэдзіны XVII ст. Магчыма, згаданыя артэфакты трапілі ў раку падчас расчысткі тэрыторыі пад будаўніцтва замка ў другой палове XVII ст.

Правесці падводнае абследаванне замкавых равоў аказалася немагчыма з-за іх забалочанасці і частковай асушанасці. На сённяшні дзень яны актыўна зарастаюць трыснягом і маладымі дрэвамі. Варта адзначыць, што руйнаванне фартэцыі ў пачатку XVIII ст. не было апошнім. У другой палове XX ст. на тэрыторыі помніка вялася актыўная сельскагаспадарчая дзейнасць. У выніку, на дадзены момант, многія фартыфікацыйныя элементы вельмі моцна зніveляваны і не прасочваюцца падчас паверхневага агляду. Таму для вызначэння дакладнай мяжы паміж ровам і валам паўстала неабходнасць правядзення шурфоўкі на мяжы сухога грунту і вільготнай забалочанай часткі помніка.

Шурф памерам 2×3,5 м, арыентаваны па баках свету, быў закладзены каля паўднёва-ўсходняга бастыёна з яго заходняга боку і даследаваўся на глыбіню 1,5 м. На глыбіні 0,92–1,19 м была выяўлена канструкцыя, ад якой захаваліся рэшткі трох драўляных брусоў прамавугольнага сячэння. Яны размешчаны гарызантальна. Першы брус выяўлены на глыбіні 1,15–1,19 м, на адлегласці 1,84 м ад усходняга кута шурфа, накіраваны на паўночны захад. Ён з двух бакоў заходзіў у сценкі шурфа. Захаванасць гэтага бруса вельмі дрэнная, у шурфе выглядаў як лінія гумусаванай зямлі шырынёй да 0,14 м. Другі брус адзначаны на глыбіні



Іл. 3. Гармата Жыгімонта III, знойдзеная ў Жаберы ў пачатку XX ст.

1,05 м, на адлегласці 2,3 м ад усходняга кута шурфа, накіраваны праз увесь шурф на паўночны захад, абодвума канцамі заходзіў у сценкі шурфа. Захаванасць дрэва добрая. Шырыня бруса складае 0,2 м, вышыня – 0,25 м. Трэці брус выяўлены на глыбіні 0,92–1,1 м, на адлегласці 3 м ад усходняга кута шурфа, накіраваны праз увесь шурф на паўночны захад, канцамі заходзіў у сценкі шурфа. Захаванасць дрэва добрая, вышыня – 0,25 м, шырыня – 0,2 м. За трэцім брусам назіралася рэзкае змяненне характару напластаванняў: супясчаны слой рэзка абрываўся і пачынаўся чорны гумусаваны слой з пясчанымі плямамі. З адзначанай змены характару напластаванняў вынікае, што вадзяны роў пачынаўся адразу за канструкцыяй, а сама канструкцыя выконвала ролю драўляных умацаванняў у падножжы вала. З-за абмежаванасці часу даследаванняў шурф не выбраны да мацерыка і быў закансерваваны.

У згаданым шурфе пад другім брусам былі знойдзены дзве марцірныя бомбы. Яны маюць шарападобную форму, дыяметр 30,2 см і важаць 48 кг. Бомбы зроблены з чорнага металу, праз цэнтр праходзіць зварачнае шво, запальныя адтуліны пустыя, напаўненне адсутнічае. На паверхні заўважаны рэшткі ад дзвюх скоб, якія выкарыстоўваліся для пагрузкі бомб у марціры. У шурфе марцірныя бомбы размяшчаліся побач адна з адной, паміж імі і ровам знаходзілася адзначаная вышэй канструкцыя. Такое размяшчэнне сведчыць аб тым, што яны былі скі-

нуты з бастыёна, а канструкцыя перашкодзіла ім упасці ў роў. Відавочна, скідванне бомб і іх засыпка зямлёй адбыліся неўзабаве пасля капітуляцыі замка ў 1706 г.

Такім чынам, на цяперашні час Жаберскі замак з'яўляецца цікавым археалагічным помнікам, які слаба даследаваны. Ужо ў першай палове XVI ст. на яго месцы існаваў двор, аб чым сведчаць пісьмовыя крыніцы і артэфакты, знойдзеныя на яго тэрыторыі. Жаберскі двор з'яўляўся цэнтрам вялікага маёнтка, аднак не меў значных умацаванняў. У другой палове XVII ст. на яго месцы намаганнямі Я. К. Дольскага быў узведзены магутны бастыённы замак, які стаў адным з найбольш значных рэзідэнцыянальных і абарончых комплексаў у рэгіёне. Ваенны патэнцыял Жаберскага замка значна ўзрос у пачатку XVIII ст. пры М. С. Вішнявецкім, які забяспечыў яго значным арсеналам і гарнізонам. Нягледзячы на гэта, фартэцыя не змагла супрацьстаяць магутнай вайсковай групоўцы шведаў на чале з Карлам XII, якая дзейнічала ў рэгіёне ў 1706 г., капітулявала і была разбурана. Згадкі ў пісьмовых крыніцах і знаходкі, зробленыя ў рацэ і равах побач з замкам, сведчаць аб тым, што падчас яго разбурэння шведы затапілі побач з фартэцыяй значную частку ўзбраення і боепрыпасаў з яе арсенала. На цяперашні час зроблены толькі першыя крокі па археалагічным вывучэнні помніка, але далейшыя даследаванні з'яўляюцца перспектыўнымі. Апрача надзвычай інтрыгуючай магчымасці знайсці затоплены арсенал фартэцыі, важна і тое, што пасля разбурэння ў 1706 г. Жаберскі замак не аднаўляўся, а яго тэрыторыя не была заселена. Гэта значыць, што ў дадзеным выпадку маецца каштоўны археалагічны помнік XVI – пачатку XVIII ст., грунтоўнае вывучэнне якога дазволіць паглыбіць нашы веды пра абарончыя рэзідэнцыі, ваенную справу і матэрыяльную культуру гэтага перыяду.

## Крыніцы і літаратура

1. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Палявы дзённік. – КП 017843/44. Біруля, І. В. Даследаванні Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. Палявы дзённік № 1. 1962 г.
2. Віцько, Д. Шведскае наступленне 1702 г. у Вялікім Княстве Літоўскім і спроба рэстаўрацыі Сапегаў // ARCHE. – 2011. – № 6. – С. 8–62.
3. Волкаў, М. Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне // Вялікае Княства Літоўскае: Права. Вайна. Дыпламатыя / Пад рэд. С. Ф. Сокала, А. М. Янушкевіча. – Мінск : БІП – Інстытут правазнаўства, 2012. – С. 219–238.
4. Волкаў, М. Умацаванні кляштара картузіянцаў у Бярозе і распаўсюджанне старагаландскай фартыфікацыйнай сістэмы ў ВКЛ // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі : Бяроза і Бярозаўскі рэгіён : зб. навук.

арт. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі / уклад.: А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2014. – С. 111–118.

5. Жучкевич В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Минск : Изд. БГУ, 1974. – 448 с.
6. Іоў, А. В. Справаздача аб археалагічных раскопках на селішчы Гарадзішча Пінскага раёна і замку Жабер Драгічынскага раёну Брэсцкай вобласці ў 1993 г. – ААНД Ін-та гісторыі Нац. Акад. навук Беларусі. – 1996. – Арх. № 1562.
7. Квачук, Е. Полесский род Выслоухов // Гістарычная брама. – 2006. – № 1. – С. 4.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1733. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 145–146. – Позва В. С. Чэрвінскага на Д. Эйсманта. 15.04.1660.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. – Ф. 14. – Воп. 1. – Спр. 74. – Арк. 202–203. – Звесткі аб старажытных фартэцыях і падземных збудаваннях, якія захаваліся ў межах Хомскай воласці Кобрынскага павета. Пач. XX ст.
10. Романов, Е. Р. По Гродненскому полесью (из записной книжки археолога) // Записки сев-зап. Отдела Императорского Русского географического общества. – Кн. 2. – Вильно, 1911. – С. 65–74.
11. Российский государственный архив древних актов (далей – РГАДА). – Ф. 389. – Д. 38. – Л. 559–563 об. – Прызнанне ліста Ядвігі Пятроўны Дзяржкоўны Янавай Булгакавай і яе сына Юрыя Булгака аб перадачы Мікалаю Нарушэвічу іх часткі маёнтка Жабер і мястэчка Холмск. 12.12.1565.
12. РГАДА. – Ф. 389. – Д. 38. – Л. 563 об.–568. – Прызнанне ліста Кацярыны Пятроўны Дзяржкоўны аб перадачы Мікалаю Нарушэвічу яе часткі маёнтка Жабер і мястэчка Холмск. 12.12.1565.
13. РГАДА. – Ф. 389. – Д. 40. – Л. 506–508. – Даравізна Станіслававай Некрашэвічавай Мікалаю Нарушэвічу яе маёнтка Жабера і мястэчка Холмск. 17.12.1559.
14. РГАДА. – Ф. 389. – Д. 240. – Л. 404–405 об. – Прызнанне ліста ўгоды Янавай Булгакавай, Мікалаевай Альжбеты і іх сыноў са Станіслававай Некрашэвічавай аб маёнтку Жабер, мястэчку Холмск і інш. 20.06.1552.
15. Северная война 1700–1721 гг. К 300-летию Полтавской победы. Сборник документов. Т. I (1700–1709 гг.) / Под ред. Л. Г. Бескровного и Г. А. Куманева. – Москва : Объединенная редакция МВД РФ; Кучково поле, 2009. – 528 с.
16. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 141 с.
17. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 2: Усвея–Яшын / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – 616 с.
18. Adlerfeld, G. The military history of Charles XII. King of Sweden. In 3 vol. – London : J. and P. Knapton, 1740. – Vol. 2. – 1740. – 338 p.

19. Archiwum Głowne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD). – Archiwum Radziwiłłów (далей – AR). – Dz. VI. – Nr. II–79. – Дзённiк Караля Станiслава Радзiвiла. 1689–1718.

20. AGAD. – AR. – Dz. VI. – Nr. II–80a. – Дзённiк Мiхала Казiмiра Радзiвiла. 1702–1761.

21. AGAD. – AR. – Dz. VII. – Nr. 646. – S. 1–2. – Спiс 19 гармат, вывезеных паводле загаду польнага гетмана ВКЛ М. С. Вiшнявецкага з Ляхавiцкай фартэцыi ў Слуцк 10 i 24 сакавiка 1703 г.

22. Henriksson, H. När stora nordiska kriget kom till Bornholm // Bornholmske samlinger. – 2014. – IV række, 8 bind. – S. 193–213.

23. Kagg, L., Lewenhaupt, A. Leonhard Kaggs dagbok 1698–1722. – Stockholm : Kungl. boktryckeriet. P. A. Nordstedt & söner, 1912. – 331 s.

24. Koskull, A. Öfverste Anders Koskull (1677–) // Karolinska krigares dagböcker: jämte andra samtida skrifter. V. 6. – Lund : Berlingska boktryckeriet, 1912. – S. 297–338.

25. Lietuvos valstybės istorijos archivas (далей – LVIA). – F. 1280. – Ap. 1. – Nr. 1423. – Акт прысягi Я. К. Дольскага аб колькасцi жыхароў у яго маёнтках. 26.06.1677.

26. LVIA. – F. 1280. – Ap. 1. – Nr. 1426. – Запiс часткi маёнтка Жабер з мястэчкам Хомск i iнш. Янам i Ганнай Тукайламi Мiкалаю Нарушэвiчу. 1.X.1573.

27. Martinaitienė, G. M. Ioannes Breutelt nos fecit. – Vilnius : Nacionalinis muziejus Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės valdovų rūmai, 2014. – 158 p.

28. Morzy, J. Kryzys demograficzny na Litwie i Białorusi w II połowie XVII wieku. – Poznań : Uniwersytet im. Adama Mickiewicza, 1965. – 405 s.

29. Muzeum Wojska Polskiego. – Nr inw. 25054. – Гармата Жыгiмонта III 1631 г.

30. Niemcewicz J. U. Podroże historyczne po ziemiach polskich: od 1811 do 1828 roku. – Paryz : A. Franck, 1858. – 528 s.

31. Nordberg, J. A. Histoire De Charles XII Roi De Suede. In 2 t. – La Haie : Husson, 1744. – T. 2. – 653 p.

32. Pergamentu katalogas / Sudare R. Jasas. – Vilnius : Lietuvos TSR Mokslu akademija, Centrine biblioteka, 1980. – 614 p.

33. Riabcewicz, V. N. Skarby monet z XVI i XVII wieku na terenie obwodu Brzeskiego i Grodzieńskiego Białorusskiej SRR // Prace i materiały Museum Archeologicznego i Etnograficznego w Łódzi. Seria Numizmatyczna i Konserwatorska. – 1988. – № 6. – S. 211–239.

34. Spodaryk, A. Inskrypcja z niezachowanej armaty odlanej przez Jana Breutelta w 1647 r. // Kwartalnik historii kultury materialnej. – 2016. – R. LXIV, nr. 3. – S. 379–385.

Артыкул паступiў у рэдакцыю 13.06.2017